МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

# ТЭХНАЛОГІЯ РЭСТАЎРАЦЫІ ТВОРАЎ ДПМ (РАЗДЗЕЛ ГАБЕЛЕН)

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях
1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках)
1-15 02 01-07 – дэкаратыўна-прыкладное мастацтва
(рэстаўрацыя твораў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Праграму распрацавала выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Аждзер Н.А.

Рэцэнзенты:

Шпунт А.С., загадчык адзела навукова-рэстаўрацыйных майстэрань НММРБ

Міцкевіч А.Г., выкладчык кафедры народнага-дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БГУ культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Зацверджана**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 10 ад 12.05.2012 г.).

Установа адукацыі "Беларускі Дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Народнае мастацтва Беларусі – вялізарная частка нашай гістарычнай спадчыны і займае значнае месца ў духоўнай і мастацкай культуры краіны. Сярод розных формаў этнічнай свядомасці, што захоўваюць мінулае, традыцыйнае народнае мастацтва – адна з галоўных крыніц фарміравання сучаснай і будучай нацыянальнай культуры Беларусі, яно мае значны ўплыў на свядомасць і самавызначэнне асобы ў сістэме сусветных культур.

Габелен займае важнае месца ў нацыянальнай мастацкай культуры. У мастацтве габелену закладзены невычэрпныя магчымасці, ён дазваляе увасабляць розныя ідэі, таму кожны габелен адрозніваецца сваей унікальнасцю.

Габелены выкарыстоўваюць для арганізацыі прастранства розных памяшканняў: камерны габелен, дэкаратыўны, манументальны.

Вывучэнне курса з'яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці "рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва".

Асноўны змест курса накіраваны на авалоданне тэхнікай і тэхналогіяй апрацоўкі матэрыялаў, вывучэнне традыцыйных форм і відаў ДПМ, методык рэстаўрацыі, а таксама ўзбагачэнне іх новымі мастацка-вобразнымі, кампазіцыйнымі, тэхналагічнымі прыёмамі.

Курс прадугледжвае:

- вывучэнне вытокаў і традыцый народнага мастацтва Беларусі
- засваенне тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыялаў
- засваенне тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі
- выкананне эскізаў мастацка-вобразнага, пластычнага і кампазіцыйнага вырашэння
- выкананне вучэбнай працы ў матэрыяле
- самастойную працу студэнтаў.

*Асноўнымі мэтамі* курса з'яўляюцца развіццё мастацкіх здольнасцяў студэнтаў, фарміраванне асобы мастака і яго нацыянальнай свядомасці праз далучэнне да традыцый народнага мастацтва.

*Задачы курса:*

- раскрыццё асаблівасцей традыцыйнай культуры Беларусі праз аналіз гісторыі рамяства;
- развіццё мастацка-вобразнага мыслення;
- авалоданне выразнымі сродкамі дэкаратыўнай кампазіцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- засваенне тэхік і тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі твораў ДПМ;
- фарміраванне практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для стварэння і рэстаўрацыі мастацкіх твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Асноўны змест курса складаюць пытанні гісторыі развіцця мастацтва габелену, тэхнікі і тэхналогіі, а таксама практычныя навыкі стварэння габелену.

Метадалагічную аснову курса складаюць авалоданне рознымі тэхнікамі і тэхналогіямі перапляценняў ніцей, вывучэнне і захаванне класічных прыёмаў шпалернага ткацтва.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен *ведаць*:

- асаблівасці розных відаў ДПМ;
- уласцівасці і пластычныя магчымасці матэрыялаў;
- магчымасці дэкору;
- абумоўленасць формы матэрыялам;
- спецыфіку кампазіцыйнага вырашэння твораў ДПМ;
- функцыі колеру ў творах ДПМ.

*умець*:

- выкарыстоўваць асноўныя законы ДПМ пры стварэнні твораў;
- праяўляць вобразнае мысленне;
- ствараць завершаную танальную, колеравую ці лінейна-пластычную кампазіцыю;
- выкарыстоўваць дэкаратыўную стылізацыю формаў;
- улічваць пры распрацоўцы твораў дэкаратыўныя якасці, уласцівасці і тэхналагічныя асаблівасці матэрыялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН. ТЭХНАЛОГІЯ РЭСТАЎРАЦЫІ ТВОРАЎ ДПМ, РАЗДЗЕЛ ГАБЕЛЕН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцый | дробнагруп. | сам. раб. |
| **Раздзел I. Развіццё мастацтва габелену.** | | | | |
| Тэма 1. Уводзіны: гісторыя станаўлення класічнай шпалеры. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 2. Традыцыі і мастацкія асаблівасці беларускага народнага дывана. Ткацкія мануфактуры на Беларусі. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 3. Сучасны беларускі габелен | 6 | 2 | | 4 |
| **Раздзел II Тэхнікі і тэхналогіі габеленапляцення.** | | | | |
| Тэма 1. Тэхналогія падрыхтоўкі матэрыялу | 24 | 2 | 8 | 14 |
| Тэма 2. Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла. Матэрыялы для рэстаўрацыі. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 3. Тэхналогія шпалернага ткацтва, прынцыпы рэстаўрацыі тканіны. | 42 | | 16 | 26 |
| Тэма 4. Тэхнікі і тэхналогія гладкага ткацтва габелена | 44 | | 16 | 28 |
| Тэма 5. Тэхнікі і тэхналогія аб’емнага ткацтва | 50 | | 18 | 32 |
| Тэма 6. Прыемы афармлення работы. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 7. Сучасны габелен. Мастацка-канструктыўныя прыёмы. | 60 | | 24 | 36 |
| Усяго: | 298 | 8 | 102 | 188 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ КУРСА

## Раздзел I. Развіццё мастацтва габелену.

**Тэма 1.** Уводзіны: гісторыя станаўлення класічнай шпалеры.

Вытокі шпалернага ткацтва. Станаўленне ўзору класічнай заходнееўрапейскай шпалеры. Сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі шпалераў.

Высокі ўзровень тэхналогіі ткацтва, адметная градацыя каларыстычнай гаммы работ мануфактуры Габеленаў.

**Тэма 2.** Традыцыі і мастацкія асаблівасці беларускага народнага дывана. Ткацкія мануфактуры на Беларусі.

Традыцыі і мастацкія асаблівасці беларускага народнага дывана. Кілімавая тэхніка.

Беларускае шпалернае ткацтва. Ткацкія мануфактуры князеў Радзівілаў, Агінскіх, Гродненскія каралеўскія мануфактуры. Тэматыка беларускіх шпалер: апавядальная пабудова кампазіцыі.

**Тэма 3.** Сучасны беларускі габелен

Этапы пераўтварэння габелена. Тры катэгорыі габелена: мануменатльны, дэкаратыўны, камерны.

Эксперыментальнасць у сучасным ручным ткацтве: уключенне новых матэрыялаў, з'яўленне аб'емных пластычных форм.

Этапы адраджэння беларускага габелена. Спалучэнне традыцый беларускага дыванаткацтва і выканання шпалераў.

Манументальныя габелены А.М. Кішчанкі, М. Савіцкага, Г.Гаркунова. Сінтэз архітэктурнага асяроддзя і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Асноўная тэматыка беларускіх габеленаў.

Творчасць А. Бельцюковай, Л. Сіваковай.

Дзейнасць Барысаўскага камбіната прыкладнога мастацтва.

Творчасць выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.

Новыя магчымасці габелена ў выяўленні мастацкага вобраза. Пошук новых выяўленчых сродкаў, формаў, сюжэтаў.

## Раздзел II Тэхнікі і тэхналогіі габеленапляцення.

**Тэма 1.** Тэхналогія падрыхтоўкі матэрыялу

Матэрыялы і абсталяванне.

Канструкцыя разборнага станка для ткацтва габелена, выбар жорсткай рамы.

Выяўленчыя магчымасці ніцей асновы, утка (структурныя адрозненні ніцей па саставу, аб'ему). Нацягванне ніцей асновы.

Узорны уток. Прыемы афарбоўкі пражы.

Падрыхтоўка "ураўніцельных" косак на палатне асновы. Функцыя рамізак.

Мастацкае афармленне дэкаратыўных тканін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 2.** Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла.

Пластычныя якасці рознай па саставу каляровай ніці.

**Тэма 3.** Тэхналогія шпалернага ткацтва, прынцыпы рэстаўрацыі тканіны.

Спосабы ўвасаблення малюнка ў шпалерным ткацтве. Класічнае палатнянае перапляценне. Стварэнне крывалінейных контураў і форм. Мадэляванне формы выявы. Узбагачэнне кампазіцыі дадатковымі адценнямі. Стварэнне выразных вертыкаляў.

Спосабы атрымання цэльнага палатна.

**Тэма 4.** Тэхнікі і тэхналогія гладкага ткацтва габелена

Тэхналогія палатнянага перапляцення. Спалучэнне ніцей аднаго, розных колераў. Простае спалучэнне на агульную ніць асновы.

Спалучэнне дзвух фрагментаў кампазіцыі. Крывалінейная пракідка. Скарачэнне і павялячэнне памеру пракідкі.

**Тэма 5.** Тэхнікі і тэхналогія аб’емнага ткацтва

Прыемы ручнога ткацтва, якія даюць візуальныя эфекты (абвіванне утком дзвух ніцей асновы, егіпецскае пляценне, гампаж).

Ворсавыя і махровыя тэхнікі у сучасным габелене (вузел “гіордэс”, “букле”).

Уключэнне асноўных прыемаў ворсавай тэхнікі ручнога дыванаткацтва ў сучасныя работы.

Прынцыпы рэстаўрацыі. Рэканструкцыя.

**Тэма 6.** Прыемы афармлення работы.

Зрэзка выраба. Апрацоўка края і варыя нты афармлення работы.

**Тэма 7.** Сучасны габелен. Мастацка-канструктыўныя прыёмы.

Традыцыйныя і наватарскія канструктыўна-пластычныя рашэнні.

Распрацоўка эскіза і выкананне твора на аснове традыцыйных і новых тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА ПА КУРСУ. АСНОЎНАЯ.


1. Бирюкова, Н. Французские шпалеры конца XV – XX века в собрании Эрмитажа / Н. Бирюкова. - Ленинград: Аврора, 1974. - 100 с.
2. Дворкина, И. Гобелен за десять вечеров / И. Дворкина. - М., 1998.
3. Жук, В.Н. Декоративно-прикладное искусство Беларуси XVIII-XX вв. Становление и тенденции развития / В.Н. Жук. – Минск: Белорусская наука, 2006.
4. Крепак Б.А. Кищенко А./ Альбом. - М.: Сов. Художник, 1998. - 128с.: ил.
5. Мельникава, Н.В. Гобелен в интерьере жилых и общественных зданий / Н.В. Мельникова. – М.: МАРХИ, 1980.
6. Негневіцкая, А. Асноўныя прыёмы ручнога ткацтва. Ператварэнне шпалеры / А. Негневіцкая. – Галарт, 1995.
7. Савицкая, В. Превращения шпалеры / В. Савицкая. — М.: Галарт, 1995.
8. Сучасны габелен беларускіх мастакоў: Каталог / Сост. Б. Крэпак. - Мінск, 1998 - 33 с.
9. Трызна, Д.С. Беларускія дываны і габелены / Д.С. Трызна. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 127 с.: іл.


## ЛІТАРАТУРА ПА КУРСУ. ДАДАТКОВАЯ.


1. Архипова, Т. Под снежным одеялом / Т. Архипова, Л. Хаметова, О. Куваева // Ручная работа. – 2009. - №23. – С.4-6.
2. Аждер, Н.А. Основы шпалерного ткачества./ Аждер Н.А. – Минск: МГОИПК, 2005. – 30с. Валынец, Н. Дзе ён, наш манументальны тэкстыль? / Н. Валынец // Мастацтва. - 2005. - №12.
3. Барвенава, Г.А. Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі / Г.А. Барвенава. - Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. - 246с.: іл.
4. Беларускія маляваныя дываны / Альбом-каталог з фондаў гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”. - Мінск, 2005.
5. Буёва, Ж.М. Художественное ткачество / Ж.М. Буёва. – Гродно: ГрГУ, 2004. – 91с.
6. Высоцкая, Н.Ф. Декоративно-прикладное искусство Белоруссии XII-XVIII веков / Н.Ф. Высоцкая. - Минск: Беларусь, 1984.
7. Гавструк, Н.Ф. Курс ткацких переплетений / Н.Ф. Гавструк. - М., 1951.
8. Каранеўская, І. Рукатворнасць, згорнутая гісторыяй / І.Каранеўская // Мастацтва. - 2001. - №11. – С 34-36.
9. Ковалевская, Л. Дело тонкое / Л. Ковалевская, Е. Яхно // Ручная работа. – 2008. - №18. – С. 24-25.
10. Крыўліна, К. З гісторыі беларускага габелена / К.Крыўліна // Мастацтва. – 2003. - №4. – С 32-33.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Лабачэўская, В.А. Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В.А. Лабачэўская. - Мінск: Беларуская навука, 1998. - 305с.: іл.
12. Литовский гобелен / Альбом. Сост. Д.Рякяртайте-Начюлене, С.Стялингене.- Вильнюс: Вага, 1983. - 238с.: ил.
13. Паньшина, Н. Н. Декоративно-прикладное искусство / Н.Н. Паньшина. – Минск: Народная асвета, 1975.
14. Сахута, Е.М. Художественные ремёсла и промыслы Белоруссии / Е.М. Сахута. - Минск.: Наука и техника, 1988. – 270 с.: ил.
15. Селивончик, В.Н. Возрождение ремесла / В.Н. Селивончик, М.Н. Винникова / Пособие по ручному узорному ткачеству. - Минск: Полымя, 1993.
16. Шунейка, Я. "З клубком нітак арыядны" Шунейка Я. / Мастацтва. – 2007, №7с. 10-11.
17. Эдит Вигнере/ Сост. Т.Стриженова. - М.: Советский художник, 1979. - 112с.: ил.
18. Экспериментальный текстиль: Каталог / Сост. Л.Д. Финкельштэйн. - Минск: Беларусь, 1990. - 24с.
19. Arrasy flamandzkie na wawelu/ Pod kierunkiem Ierrego Szablowskiego. - Warszawa: Arkady, 1975. - 501s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ